Грамовіч І.М.,
выкладчык

# АРГАНІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ ПА КУРСУ "ФАЛЬКЛОРНЫ ГУРТ"

Праблемы, звязаныя з выкананнем беларускай народнай песні, турбуюць многіх даследчыкаў. Зараз узнікае шмат калектываў, цалкам створаных з моладзі, малавыхаванай, якая не разбіраецца ў спецыфіцы мясцовых традыцый. Стваральнікамі такіх калектываў з'яўляюцца і выхаванцы Мінскага універсітэта культуры. Менавіта таму арганізацыя вучэбнага працэсу на сучасным этапе павінна быць накіравана на выхаванне спецыялістаў высокай кваліфікацыі ў галіне беларускай народнай песеннай творчасці. Для гэтага патрэбен якасна новы метадычны падыход да вывучэння і навучання народнай песеннай манеры спеваў.

Спецыяльная праграма па курсу "Фальклорны гурт" прадугледжвае асноўныя напрамкі навучання будучых кіраўнікоў фальклорных калектываў. У задачы курса ўваходзяць:

- авалоданне практычнымі навыкамі і ведамі гуртавых спеваў;
- засваенне практычных навыкаў і ведаў пры спевах з рухамі і рознымі падтанцоўкамі;
- авалоданне манерамі народных спеваў і спецыфічнымі прыёмамі традыцыйнага гукавыцягвання ва ўмовах калектыўнай гуртавой узгодненасці;
- авалоданне песеннымі стылямі розных раёнаў Беларусі (Паазер'е, Палессе, Цэнтральны раён, Магілеўшчына);
- авалоданне методыкай работы з фальклорным гуртам (фальклорны гурт - эксперыментальная лабараторыя).

Кіраўнік-выкладчык павінен прывіць студэнтам любоў да роднай песні і, самае галоўнае, выхаваць знаўцу рэгіянальных песенных традыцый.

Праца са студэнтамі прадугледжвае лабараторныя і практычныя заняткі. На лабараторных занятках праводзіцца падрыхтоўчая работа да гуртавых спеваў - праслухоўванне і разбор запісаў фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу.

Практычныя заняткі - гэта непасрэдна навучанне рэгіянальнай песеннай традыцыі з улікам усіх яе асаблівасцей і авалоданне ёю.

На занятках фальклорнага гурту выкладчык ставіць наступныя задачы:

- вывучэнне жанраў народных песень і засваенне прынцыпаў іх выканання;
- авалоданне дыялектнымі асаблівасцямі гутарак вывучаемых твораў;
- праца над гукавымі фарбамі на прыкладах пэўных твораў;
- навучанне выкананню традыцыйных выканаўчых прыёмаў у спевах гуртом;
- складанне праграмы выступлення.

Структура заняткаў фальклорнага гурту павінна прадугледжваць творчы падыход да працы кожнага студэнта і кіраўніка-выкладчыка. Вывучэнне рэгіянальнай манеры спеваў у гурце патрабуе сістэматычнай рэпетыцыйнай працы.

Авалоданне матэрыялам гуртавых спеваў будуецца на знаёмстве з запісамі ўзораў аўтэнтычнага фальклору, а таксама на вывучэнні творчасці фальклорных гуртоў (майстэрства выканання, рэпертуар, манера спеваў, дыялектныя асаблівасці, стылевыя асаблівасці, спосабы імправізацыі).

У спевах неабходна звярнуць увагу на пластыку выканання гука, атаку гука, асаблівасці народнай гаворкі. У працы над гуртавой партытурай патрэбна ўлічваць заўвагі па захаванні спеўнай пазіцыі, гукавядзенні, агласоўцы гукаў, народнай мелізматыцы, гуртавым гукавым адзінстве, артыстычнай выразнасці. Выкананне твораў павінна адлюстроўваць асабістыя адносіны да мастацкага сэнсу, умоў бытавання песні, яе жанравай і рэгіянальнай прыналежнасці. Пры гэтым трэба ўлічваць, што засваенне традыцыйнага народнага выканання ў адрыве ад вопыту народных выканаўцаў - задача невырашальная.

Праграма па курсу "Фальклорны гурт" з'яўляецца якасна новай, вынікі яе рэалізацыі па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне народнапесеннага выканання прадугледжваюць укараненне новага метадычнага падыходу па вывучэнні асаблівасцей рэгіянальных гуртавых спеваў і навучанні рэгіянальнай манеры выканання на Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ